# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕРГ
19 лістапада
1992 года
№ 20
(1685)


НАША ЎЗЯЛА!

## ТОЕ, ЧАГО ТАК НАСТОЙЛІВА ДАМАГАЛІСЯ РАБОТНІКІ АДУКАЦЫІ, АДБЫЛОСЯ: НАРЭШЦЕ, ВЯРХОЎНЫ САВЕТ РАЗГЛЕДЗЕЎ ПЫТАННЕ АБ НЕВЫКАНАННІ ЎРАДАМ У ПОЎНЫМ АБ,ЁМЕ ЗАКОНА «АБ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ»

Некалькі дзён запар, стоячы ў пікетах на плошчы Незалежнасці, выкладчыкі ВНУ і настаўнікі сярэдніх школ з надзеяй пазіралі ў бок будынка Дома ўрада.

На абмеркаванне сесіі былі вынесены два праекты пастановы — ад Савета Міністраў і ад Камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны.

Пакуль дэпутаты асэнсоўвалі сутнасць абодвух, пікетчыкі паспелі на некалькі гадзін спыніць рух транспарту.

Дзіўна і, у той жа час, пэўна, заканамерна для постсацыялістычнага грамадства, што многіх прадстаўнікоў урада ахоплівае сапраўдны жах пры адной думцы, што настаўнік пачне атрымліваць больш за служачага ў прамысловасці. Зразумела, больш звыкла, калі ён выступае жабраком. Ці не такія жахі — падстава для абсмейвання цывілізаваным светам?

Пад час вострых дэбатаў большасць дэпутатаў трымаліся думкі, што ў наддзвычай складаных эканамічных умовах няма рэальнай магчымасці выйсці на поўнае выкананне Закона аб адукацыі. Такім чынам, механізмам карэкціроўкі заробку педагагічных работнікаў прадугледжваецца не сярэдняя стаўка служачых у прамысловасці, а сярэдняя заработная плата.

І ўсё ж такі паведамленне пра тое, што ў адпаведнасці з прынятай парламентам пастановай СЯРЭДНЯЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ БУДЗЕ НЕ МЕНШ ЧЫМ 100 ПРАЦЭНТАЎ, А ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА САСТАВУ НЕ МЕНШ ЧЫМ 150 ПРАЦЭНТАЎ СЯРЭДНЯЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ СЛУЖАЧЫХ У ПРАМЫСЛОВАСЦІ, — крок наперад. І стаў ён магчымым дзякуючы значным намаганням Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, Камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны.



1000 марак ФРГ перадаў рэктар Белдзяржуніверсітэта член-карэспандэнт АН Рэспублікі Беларусь Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ Слаўгарадскаму дабрачыннаму камітэту «Дзецям Чарнобыля».



ШТО НОВАГА?

## АД ГЕРМАНІІ – ДА БЕЛАРУСІ

Такім чынам на пасяджэнні вучонага савета універсітэта была выканана просьба старшыні маладзёжнага аддзялення сацыял-дэмакрытычнай партыі Германіі Інга Стуке і іншых членаў гэтай арганізацыі, з якімі рэктар сустрэўся пад час чатырохдзённага візіту ў Германію.

Падзякаваўшы, старшыня Слаўгарадскага дабрачыннага камітэта «Дзецям Чарнобыля», падзяліўся планамі будаўніцтва аздараўленчага комплексу дзя дзяцей. якія пацярпелі ад чарнобыльскаі аварыі. на тэрыторыі Шклоўскага раёна, што на Магілёўшчыне.

Дабрачыннасць, сапраўды, не ведае межаў. Будзем спадзявацца, што праз годдругі нямецкія сябры змогуць на ўласныя вочы пабачыць тыя цаглінкі, якія заклалі сёння ў выкананне добрай справы.

М. СТАТКЕВІЧ.

Фота Г. КРАСОЎСКАГА.

НУ І НУ!

## НЬЮТАН УСЁ Б ЗРАЗУМЕЎ

Не дачакаўшыся пакуль, нарэшце, даследчыкі распрацуюць спецтэрміналогію на беларускай мове для прыродазнаўчых навук, на другім курсе фізічнага факультэта пайцілі далей — вырашылі выкладаць і навучацца на больш распаўсюджанай англійскай мове. Ні ў якім разе не ў процівагу мове беларускай, наадварот — гэта спроба наблізіцца да сусветнага ўзроўню, спроба даць магчымасць студэнтам адчуць тое асяроддзе, у якім жыве навуковае замежжа.

Англамоўныя, па дамоўленасці студэнтаў і выкладчыкаў, не толькі лекцыі, але і практычныя заняткі. Група складаецца з 20 чалавек, 12 з іх займаюцца аднаchасова ў групе з лаглыбленым вывучэннем замежнай мовы.

А ўвогуле, па словах Леаніда Іванавіча Бурава, дацэнта кафедры агульнай фізікі. цяжкасці не напужалі, як заўсёды здараецца, самых працавітых і таленавітых студэнтаў. Дарэчы. менавіта ён чытае ў гэтай групе лекцыі. А практычныя заняткі праводзіць старшы выкладчык той жа кафедры Тадэуш Альфонсавіч Пяркоўскі.

Справа толькі пачынаецца. Мажліва, у далейшым у фізікаў-«англічан» з'явіцца магчымасць стажыравацца нейкі час за мяжой. А калі ўлічыць, што мноства навуковай літаратуры ўсё ж на англійскай мове — практыка для студэнтаў цудоўная. Падручнікамі, праўда, часта даводзіцца карыстацца рускімі. І, зразумела, галоўны акцэнт выкладчыкі робяць на веданне спецыяльнага прадмета. Замежная мова выкладання — гэта пакуль эксперымент.

НАВІНЫ ЗАМЕЖЖА

## ЧАЛАВЕК ГОДА — НАШ ЧАЛАВЕК

Радасная навіна далянела да БДУ — Кембрыджскі міжнародны біяграфічны цэнтр назваў чалавекам года дацэнта кафедры паліталогіі В. ШАЛЬКЕВІЧА за серыю работ па гісторыі беларускай грамадскай думкі.

Віншавальную тэлеграму атрымаў і загадчык кафедры Беларускай акадэміі мастацтваў прафесар Г. ВАШЧАНКА.

Як вядома, чалавек года выбіраецца сярод дзесяткаў тысяч біяграфій, якія даследуюцца ў Кембрыджскім міжнародным цэнтры.

ПРЫВІТАННЕ!

## А ДНІ ФІЗІКАЎ УСЁ РОЎНА ЎСЕСАЮЗНЫЯ

Звыклае слова адразу не выкрасліш. Традыцыя Усесаюзных Дзён фізікаў нарадзілася яшчэ ў часы адзінства Саюза і, як бачым, сапраўды перажыла яго. Аргкамітэт, пакінуўшы ў назве слова «ўсесаюзны» (адзначыўшы яго толькі пытальнікам), імкнецца, каб свята па-ранейшаму аб'ядноўвала студэнтаў-фізікаў на ўсёй прасторы былога Саюза.

Дні фізікаў праходзяць з 16 да 22 лістапада. Як паведаміў Андрэй Жвалеўскі, намеснік старшыні аргкамітэта, чакаецца каля 200 чалавек з блізкага замежжа. Размесцяцца яны недалёка ад Мінска, у лагеры адпачынку «Мір».

Праграма УДФ-6 складаецца з дзвюх асноўных частак: навукова-практычнай канферэнцыі «Фізіка і камп'ютэр» і культурнай праграмы. Работа канферэнцыі арганізавана па прынцыпу свабоднага рынка продажу і абмену праграм.

Плануецца правесці каля 13 канцэртаў лепшых студэнцкіх тэатраў, а таксама гумарыстычных клубаў, якія ставяць мэтаю паказаць людзям, што фізіка мае чалавечы твар.

А адным з цікавейшых як для гасцей, так і для студэнцтва горада відовішчаў будзе адкрыты чэмпіянат па класічнаму «Тэтрысу» — найбольш папулярнай камп'ютэрнай гульні.

Пажывём — пабачым! А пакуль глядзіце трэцюю старонку.

ДОШКА АБ'ЯЎ

ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ (ДАДАТКОВЫХ) ПРАФЕСІЙ І інфармацыйна-навучальны цэнтр «Веды» аб'яўляюць набор слухачоў на наступныя аддзяленні:

польскай мовы (тэрмін навучання 3 месяцы);

стэнаграфіі (6 месяцаў);

нямецкай мовы (1 год);

касметолагаў (3 месяцы);

турызму і аховы прыроды (1 год).

Пасля заканчэння навучання выпускнікам выдаецца пасведчанне. Заняткі праводзяцца ў вячэрні час.

За больш падрабязнымі даведкамі звяртайцеся па тэлефоне 96-11-22 альбо на адрас: вул. Бабруйская, 9, пакой 61.

ДЭКАНАТ.

ПАРАЎНАЕМ?

## ДАРАЖЭНЬКІЯ ВЫ, РУБЛІКІ!

Зарплата выкладчыкаў ВНУ Масквы складае ад 2700 (дацэнты) да 3500 (прафесары), у той час, калі прафесар у Якуцку дзякуючы мясцоваму бюджэту (які напаўняецца ў асноўным даходамі ад продажу якуцкага золата і дыяментаў) атрымлівае штомесячна каля 26 тысяч рублёў.

У Грузіі стыпендыя студэнта — 500, а зарплата выкладчыка — 2250 рублёў. А плата за навучанне ў некаторых ВНУ даходзіць да 20 тысяч у год.

УСЕ ПРАФЕСІІ ПАТРЭБНЫ

## КАЛІ МАМЫ НЯМА ДОМА

Вы не лічыце сябе надта прыгожым, каб ператтварыцца ў хуткім часе ў фотамадэль? Тады скарыстайце магчымасць палепшыць сваё фінансавае становішча з дапамогай турыстычна-камерцыйнай арганізацыі «Саннітурс», якая ўзваліла на свае плечы цяжар бацькоўскіх праблем па выхаванню дзяцей. Вырашаць іх, праўда, давядзецца студэнтам і студэнткам.

Прэзідэнт арганізацыі Аляксандр Сцяпанавіч Ванюкоў спадзяецца, што справа будзе на карысць усім. Аплата нагадзінная: удзень — 45—50 рублёў за гадзіну, увечары — 67—75 рублёў. Дарэчы, аплата будзе расці разам з агульнымі цэнамі. У перспектыве бэбі-сітэры, магчыма, паедуць вучыцца на нейкі час за мяжу, дзе такая практыка існуе ўжо даўно.

Калі няздзейсненая мара вашага жыцця — няньчыць дзяцей, а сваіх пакуль завесці не давялося, тэлефануйце — 53-67-59.

САКРЭТ ФІРМЫ

## ЦЫП, ЦЫП, ЦЫП, МАЕ ІДЭІ!

Праект «Бізнес-інкубатара» распрацаваны выкладчыкамі і студэнтамі Кіеўскага політэхнічнага інстытута і іх калегамі з Вялікабрытаніі.

Асноўная яго задача — пошук і падтрымка розных перспектыўных ідэй. Не толькі маральная, але і матэрыяльная. Маркуецца, напрыклад, дапамагаць таленавітым студэнтам у стварэнні ўласных фірм і прадпрыемстваў.

Аналагічных інкубатараў, аказваецца, існуе ва ўсім свеце каля 250.

## БЕЛАРУСКІ БІЗНЕС У ЗША

Дагавор аб сумесным выданні часопіса пад назвай «Белорусский деловой вестник» падпісалі на мінулым тыдні Беларускі эканамічны універсітэт, Беларускі лінгвістычны універсітэт, Акцыянернае таварыства НІК і прэзідэнт амерыканскай кампаніі «Кіме інтэрнэйшнл трэйд консульт» Вільямс Кіме.

Часопіс будзе выдавацца і распаўсюджвацца ў ЗША. Збор, падрыхтоўка і перадача інфармацыі ажыццяўляецца беларускім бокам.

ЦЯЖКІ ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

# БУДАВАЛІ, БУДАВАЛІ... ЯК БУДЗЕМ ДЗЯЛІЦЬ?

***Чуткі ў наш час распаўсюджваюцца, нават апераджаючы дзеянні: не паспелі члены прафсаюзнага камітэта разгледзець пытанне аб падзеле чатырох пакаёвых і аднапакаёвых кватэр у пабудаваным ужо пад'ездзе дома па вуліцы Варанянскага, як у Міністэрства пайшлі скаргі ад супрацоўнікаў універсітэта.***

Найбольш крытычная сітуацыя склалася ў справе падзелу 14 «чатырохпакаёвак». Вось чаму на мінулым вучоным савеце універсітэта абмяркоўвалася пытанне аб асноўных крытэрыях.

Такім чынам, узважце свае магчымасці, перш чым прэтэндаваць на паляпшэнне жыллёвых умоў.

Будуць улічвацца:

1. Пастаноўка на чаргу па паляпшэнню жыллёвых умоў у выканкоме.

2. Стаж работы ва універсітэце (не пазней чым з 1981 года).

3. Прыналежнасць да прафесарска-выкладчыцкага саставу.

4. Састаў сям'і — не менш чым 4 чалавекі (для прэтэндэнтаў з вучонай ступенню).

5. Навуковыя супрацоўнікі з вучонай ступенню.

6. Ільготнае права многадзетных сем'яў на атрыманне жылля.

7. Іншыя асаблівыя ўмовы.

8. Меркаванне калектыву.

Пры выдзяленні аднапакаёвых кватэр дзейнічаюць наступныя крытэрыі:

1. Пастаноўка на чаргу ў выканкоме.

2. Стаж работы ва універсітэце (не пазней чым з 1987 года).

3. Прыналежнасць да прафесарска-выкладчыцкага саставу.

4. Ільготамі карыстаюцца сем'і з дзецьмі.

Зразумела, і тут сваю ролю адыграюць іншыя асаблівыя ўмовы і меркаванне працоўнага калектыву.

НЕ АБМІНІЦЕ!

# АДВЕЧНАЙ РАДАСЦЮ СУПРАЦЬ СНІДу

**1 снежня — Сусветны Дзень барацьбы са СНІДам. У нашай рэспубліцы ён пройдзе пад дэвізам «Дзеячы мастацтваў, культуры і таленавітай моладзі супраць СНІДу». Напярэдадні яго ва універсітэце адбудзецца шэраг дабрачынных канцэртаў лепшых самадзейных калектываў БДУ. Усе яны пройдуць у актавай зале галоўнага корпуса і будуць пачынацца а 19 гадзіне ў розныя дні.**

**23 лістапада можна ўбачыць выступленне народнага аркестра народных інструментаў (дырыжор — Алег Шапялевіч). 24 лістапада вас чакае сустрэча з акадэмічным хорам студэнтаў пад кіраўніцтвам Маргарыты Лапкоўскай. 25-га прыходзьце на канцэрт народнага ансамбля танца «Крыжачок» (мастацкі кіраўнік — Канстанцін Зубік), а 26-га — народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш» (мастацкі кіраўнік — Валянціна Гладкая). 27 лістапада ў актавай зале выступіць узорны дзіцячы ансамбль танца «Літарынка», якім кіруе Таццяна Зубік. Завершыцца тыдзень дабрачынных канцэртаў прадстаўленнем, у якім прымуць удзел народны тэатр і каманда КВЗ універсітэта пад кіраўніцтвам Андрэя Андрэева, а таксама ансамбль пантамімы «Приказ» на чале з Дзмітрыем Карэнка.**

**Зразумела, нават самае высокае мастацтва не вылечыць хворага на жудасны СНІД. Наўрад ці спыніць яно і тых, хто свядома стаў на шлях, які вядзе да гэтай хваробы. Але ўсім астатнім яно можа нагадаць пра адвечную радасць жыцця і яго непаўторнасць. Прыходзьце на канцэрты — пераканайцеся ў гэтым.**

ВЫ ЧУЛІ?

# ТОЛЬКІ ЧЛЕНАМ ПРАФСАЮЗА

Прэзідыум савета Федэрацыі прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь устанавіў стыпендыю для студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў.

Прадугледжаны тры студэнцкія стыпендыі па 1,5 тысячы рублёў кожная і тры стыпендыі па 1200 рублёў для навучэнцаў. Яны будуць прысуджаны тым, хто добра вучыцца і актыўна ўдзельнічае ў жыцці сваёй прафсаюзнай арганізацыі.

Выплата праводзіцца са сродкаў рэспубліканскага Фонду сацыяльнай дапамогі студэнтам і навучэнцам.

# Хто ж той дастойны?

Пакуль невядома, хто са студэнтаў-гісторыкаў нашага і Гродзенскага універсітэтаў заслугоўвае гонару атрымліваць стыпендыю імя нядаўна памёршага Міхася Ткачова, але рашэнне аб устанаўленні дзвюх стыпендый з партыйнага бюджэту ўжо прынята на пленуме Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. Справа ў тым, што вядомы вучоны з'яўляўся яшчэ і старшынёй рады Грамады.

САМ-НАСАМ З МІНІСТРАМ

# Выпускнік гістфака Пётр КРАЎЧАНКА: «БЕЛАРУСЬ МОЖА СТАЦЬ 25-й ЗОРКАЙ НА СЦЯГУ ЕЎРОПЫ»

***Ёсць крытэрый! Калі вы марыце стаць міністрам, паспрабуйце ацаніць свае шанцы з яго дапамогай. Уявіце, аб чым вы гаварылі б, вярнуўшыся ў альма матэр праз некалькі гадоў пасля развітання з ёй. Ці хапіла б у вас пораху на некалькі гадзін талковай, грунтоўнай гаворкі? Арыентавацца можаце на міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пятра Кузьміча КРАЎЧАНКУ. 6 лістапада ён наведаў родны гістарычны факультэт, які скончыў у 1972 годзе, і амаль дзве гадзіны вёў цікавую, кампетэнтную размову з залай.***



Былы студэнт, аспірант і выкладчык гістарычнага факультэта БДУ Пётр Краўчанка сёння з'яўляецца шостым у гісторыі Беларусі пасля 1917 года кіраўніком яе знешнепалітычнага ведамства. І на сустрэчу з факультэтам ён прыйшоў не толькі як яго выпускнік, але і як асоба, зацікаўленая ў падрыхтоўцы кадраў для беларускай дыпламатыі — аб чым засведчыў у самым пачатку размовы. Пётр Кузьміч лічыць разумным і лагічным крокам адкрыццё аддзялення міжнародных адносін менавіта на гістарычным факультэце. Яго ўласны прыклад пацвярджае: гісторык у дыпламатычным корпусе вельмі дарэчы.

Спачатку міністр спыніўся на гісторыі беларускай дыпламатыі і запэўніў прысутных, што такая гісторыя існуе. Ён лічыць, што ў 20-я гады Беларусь перажыла залатое дзесяцігоддзе, калі дабілася свайго прызнання ў свеце і існавала як дзяржава з пэўнымі элементамі незалежнасці. Прадстаўнікі беларускай дыпламатыі працавалі ў дзевяці еўрапейскіх дзяржавах. Але пасля ўтварэння СССР 31 снежня 1922 года становішча змянілася, пасланцы Беларусі пастулова пакінулі сталіцы гэтых краін, і да 1944 года наша рэспубліка практычна не займалася знешнепалітычнай дзейнасцю. Калі вынікі другой сусветнай вайны сталі відавочнымі, калі рыхтавалася стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Сталін імкнуўся зрабіць усё магчымае для пашырэння ўплыву Савецкай дзяржавы ў свеце і таму змяніў свае адносіны да дзейнасці знешнепалітычнага ведамства.

У кастрычніку 1945 года ў Сан-Францыска Беларусь стала членам ААН. Прычым, таксама як Украіна, не проста ўвайшла ў склад «сусветнага парламента», але атрымала статус краіны-заснавальніка гэтай арганізацыі. Для нашай рэспублікі ўдзел у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый апошнія 46 гадоў быў практычна адзінай магчымасцю кантактаў з замежнымі краінамі, выхаду на міжнародную арэну. Выказаўшы гэтую думку, Пётр Кузьміч Краўчанка не стаў ацэньваць дзейнасць БССР у ААН адназначна. І перавёў гаворку аб гісторыі ў рэчышча апошніх падзей.

— Я перакананы, што ў нас няма іншага шляху,— так цвёрда выказаўся міністр замежных спраў Беларусі аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў.— Для нашай рэспублікі СНД — адзіная ў эканамічным сэнсе магчымасць падтрымліваць больш-менш якасны ўзровень жыцця. У сыравінным сэнсе Беларусь вельмі залежыць ад Усходу, ад Расіі — 96 працэнтаў усіх яе энерганосьбітаў звязаны з тым бокам. Беларусь здабывае прыкладна 1 мільён 800 тысяч тон сырой нафты, а выкарыстоўвае ва ўнутраных мэтах 24 мільёны тон, прычым прыкладна 40 мільёнаў тон сырой нафты перапрацоўвае на сваіх магутнасцях. Відавочна, што з цягам часу нашы сыравінныя цяжкасці будуць павялічвацца. У гэтым сэнсе Беларусь сярод краін СНД знаходзіцца, бадай, у самым складаным становішчы. Я знаёміўся з вынікамі параўнальнага аналізу забеспячэння Беларусі і Украіны сыравіннымі крыніцамі. Калі прыняць нармальнае становішча ў гэтым пытанні за 100 працэнтаў, Украіна забяспечана такімі крыніцамі на 90 працэнтаў, а мы — на 10. Лепшая сітуацыя ў Казахстане: гэта чацвёртая краіна ў свеце па колькасці сыравінных крыніц.

Такім чынам, Садружнасць для Беларусі — амаль што пытанне жыцця і смерці. Але ж мы абвясцілі сябе незалежнай дзяржавай. Мне здаецца, наш парламент падышоў да гэтага пытання вельмі эмацыянальна, на нейкай рамантычнай ноце. Нейтралітэт быў абвешчаны ў той час, калі Еўропа падзелена на ваенныя блокі, калі на нашай тэрыторыі існуе ядзерная зброя, калі ўся Еўропа рухаецца да інтэграцыі, калі нават краіны класічнага нейтралітэту — у першую чаргу, Швейцарыя, Швецыя, Аўстрыя, Фінляндыя — імкнуцца да ўдзелу ў агульнаеўрапейскай эканамічнай і палітычнай супольнасці. Я думаю, што прыкладна ў 1995—1996 годзе гэтыя краіны стануць тымі чатырма залацістымі зорачкамі на блакітным сцягу Еўропы, якія дапоўняць да лічбы «16» сённяшнія дванаццаць.

Як у такой сітуацыі разумець беларускі нейтралітэт? Ці ёсць ён? Як рухацца да яго? Наша міністэрства сёння разглядае нейтралітэт не як рэчаіснасць, а як мэту, як шлях, як працэс. Тэарэтычна Беларусь можа быць нейтральнай, але не раней, чым у 1999 годзе, калі мы павінны згубіць статус ядзернай дзяржавы, перадаўшы ядзерную зброю, якая знаходзіцца на нашай тэрыторыі, Расіі. Гэта можа адбыцца і раней, калі парламент прыме адпаведнае рашэнне.

У мяне ёсць сваё бачанне таго, як будзе развівацца наша нацыянальная гісторыя ў далейшым. Я абмяркоўваў сваю мадэль з міністрамі замежных спраў прыкладна 20 краін і атрымаў іх падтрымку ў гэтым пытанні. Я думаю, што на працягу бліжэйшых 20 гадоў у межах СНД будзе паступова складвацца тое, што я ўмоўна называю ўсходнееўрапейскім эканамічным рынкам. Рынкам, які захавае цэлы шэраг рысаў былой эканомікі з яе складанасцямі. У той жа час у Еўропе будзе паралельна існаваць агульнаеўрапейскі рынак. Магчыма, гэтыя дзве супольнасці будуць развівацца з адначасовым збліжэннем. Але ставіць пытанне аб іх інтэграцыі сёння немагчыма. Еўропа не збіраецца прымаць нас у Агульны рынак, бо мы наогул не падрыхтаваны да яго, ні юрыдычна, ні эканамічна. Нам патрэбна змяніць стандарты. Напрыклад, нашы трактары і аўтамабілі не адпавядаюць агульнаеўрапейскім экалагічным стандартам, таксама як чыгуначныя і аўтамабільныя дарогі адрозніваюцца ад тых, што існуюць у Еўропе, нават стандарт такой дробязі, як бутэлька, іншы.

Для пераходу ў агульнаеўрапейскае эканамічнае супольніцтва нам спатрэбіцца не адзін дзесятак гадоў. І вялікія сродкі. Падлічана, што Швейцарыі для гэтага пераходу патрэбна 4 мільярды швейцарскіх франкаў. Спачатку нам трэба змяніць структуру прамысловасці, павысіць экспартныя магчымасці нашай прадукцыі, навучыцца зарабляць валюту і ўвесці сваю нацыянальную. На маю думку, у Беларусі ёсць нашц стаць прыкладна 23—25-й зорачкай на блакітным сцягу Еўропы. І адбыцца гэта можа ў 2005 годзе ці крыху пазней. Але падкрэсліваю яшчэ раз — у агульнаеўрапейскі рынак мы павінны рухацца ў межах Садружнасці.

Адносіны Беларусі з краінамі «далёкага» замежжа міністр замежных спраў Пётр Кузьміч Краўчанка ацаніў як нядрэнныя. Ён паведаміў прысутным, што ў апошнія месяцы з'явіліся пасольствы і прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь у ЗША (пасольства ў Вашынгтоне і пастаяннае прадстаўніцтва пры ААН, у Нью-Йорку), у Варшаве, Парыжы, Вене, Жэневе (прадстаўніцтва і адначасова пасольства Рэспублікі Беларусь у Швейцарскай канфедэрацыі). У бліжэйшыя месяцы ці гады плануецца адкрыццё беларускіх пасольстваў у Кітаі, Бельгіі (праз Брусель як цэнтр многіх палітычных і ваенна-палітычных саюзаў ёсць магчымасць выйсці яшчэ на 12 краін Заходняй Еўропы), Стакгольме, Рыме, у Ватыкане і сталіцах іншых дзяржаў. Акрамя таго, у хуткім часе будзе адкрыта пасольства Рэспублікі Беларусь у Маскве, Кіеве і Алма-Аце, а пазней — у Ташкенце, Вільнюсе, Рызе і Таліне.

На заканчэнне сустрэчы Пётр Кузьміч адказаў на пытанні прысутных, якія датычыліся ў асноўным эканамічнай палітыкі нашай рэспублікі і дзейнасці яе знешнепалітычнага ведамства. Міністр прызнаўся, што яму не хапае часу на вывучэнне замежных моў (за апошні час ім былі ўзяты 10 урокаў англійскай мовы), але яго пасада не заўсёды патрабуе іх дасканалага ведання дзякуючы працы перакладчыкаў, за выключэннем тых выпадкаў, калі размова з замежным дзеячам адбываецца сам-насам.

Нованароджанаму аддзяленню міжнародных адносін міністр замежных спраў прадказаў у будучым магчымую трансфармацыю ў факультэт і нават інстытут міжнародных адносін — як гэта здарылася ў Кіеве. Будучых выпускнікоў аддзялення Пётр Кузьміч папярэдзіў аб неабходнасці абавязковага ведання беларускай мовы і аб канкурэнцыі, якую могуць ім скласці на шляху да працы ў міністэрстве замежных спраў выпускнікі інстытута замежных моў.

— Сёння нам як паветра патрэбны дыпламаты-знаўцы гісторыі,— падкрэсліў міністр у канцы свайго выступлення на гістфаку.— Зараз міністэрства пашырае сваю дзейнасць, і на гэты момант мы гатовы ўзяць на работу 20 спецыялістаў. Але аддзяленне міжнародных адносін павінна даказаць высокі ўзровень кваліфікацыі сваіх выхаванцаў. Мы не можам даць гарантыі, што возьмем у штат міністэрства іх усіх. Прыняты на работу будуць лепшыя.

**На сустрэчы прысутнічала В. БЯГУН.**

# ВІН-ШУ-ЕМ!



*25 лістапада споўніцца 70 гадоў Ефрасінні Леанідаўне **БОНДАРАВАЙ**, доктару філалагічных навук, прафесару кафедры тэорыі і практыкі журналістыкі.*

*Напярэдадні юбілею Ефрасіння Леанідаўна прызналася: «Гэта раней юбілеяў чакалі як урачыстасцей і нагоду для дадатковай пашаны, а зараз...»*

*Тым не менш, рэдакцыя «БУ», усе супрацоўнікі якой — былыя вучні Ефрасінні Леанідаўны, сардэчна віншуе яе з круглай датай і з тым, што ў свае гады яна захавала маладосць душы і энергічнасць. Няхай кожны дзень дорыць Вам толькі прыемныя ўражанні і цікавыя сустрэчы, няхай ніколі не падводзіць Вас здароўе і не пакідае аптымізм!*

**Гартаючы старыя падшыўкі нашай газеты, мы шмат разоў бачылі імя Ефрасінні Леанідаўны Бондаравай на яе старонках. Спадзяёмся, усім будзе цікава прачытаць некаторыя з гэтых радкоў, а самой юбілярцы — прыемна ўспомніць мінулае.**

У лістападзе 1972 года «Беларускі універсітэт» віншаваў Е. Л. Бондараву з 50 гадовым юбілеем: «Часта, разгарнуўшы свежую газету, мы сустракаем знаёмае імя — Ефрасіння Бондарава. Гэта яна, наш таварыш-журналіст, кіназнаўца, выступіла з чарговай рэцэнзіяй на новы фільм ці з праблемным артыкулам па пытаннях мастацтва.

І ў гэты ж дзень мы можам убачыць яе ў студэнцкай аўдыторыі факультэта журналістыкі — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Ефрасіння Леанідаўна Бондарава чытае чарговую лекцыю або вядзе практычныя заняткі.

А калі празвініць апошні званок і апусцеюць аўдыторыі, Е. Л. Бондараву зноў можна ўбачыць сярод моладзі. Яна кіруе студэнцкім навуковым гуртком па праблемах публіцыстыкі.

У 1949 годзе Е. Л. Бондарава закончыла факультэт журналістыкі. Абараніла кандыдацкую дысертацыю, працавала галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў Міністэрства культуры БССР, займала іншыя адказныя пасады. Але ўвесь час была звязана з факультэтам журналістыкі, а з 1962 года перайшла сюды на пастаянную работу».

**На шэсць гадоў раней, 25 лістапада 1966 года, газета «Беларускі універсітэт» надрукавала вялікі артыкул Е. Л. Бондаравай, члена Саюза кінематаграфістаў СССР «Як глядзець фільм?». Вось урывак з яго.**

«Як глядзець кінафільм? Адны могуць здзівіцца, пачуўшы такое пытанне: хіба не вядома «як»? Другія могуць угледзець спробу неяк рэгламентаваць кінагледача. Трэція адкажуць: усё залежыць ад таго, што глядзіш. Добры фільм захапляе ўсіх, дрэнны — нікога. Значыць, трэба выпускаць на экраны добрыя фільмы, і ніякай праблемы гледача не будзе. Гэта бясспрэчна, што патрэбны добрыя фільмы. Але ж пакуль што такой ідыліі не назіраецца. Разам з паўнацэннымі кінатворамі нямала паказваецца шэрых, рамесніцкіх ці ілжэнаватарскіх падробак пад іх. Пастаўляюць іх і нашы савецкія, і зарубежныя кінастудыі...

Перш-наперш варта разабрацца, спытацца ў самога сябе: што я шукаю ў мастацтве наогул, у кінамастацтве ў прыватнасці? Ці толькі забавы, адцягнення ўвагі ад штодзённых клопатаў? Тады гэта вельмі мала. Мастацтва здольна на значна большае. Яно можа натхняць, уплываць на думкі і пачуцці, на ўвесь духоўны воблік чалавека. Але гэта пад сілу толькі сапраўдным творам мастацтва, тым, якія напоўнены глыбокім зместам, азораны перадавой ідэяй, вызначаюцца дасканаласцю формы...»

НА ЗДЫМКУ: у час творчай сустрэчы з Аляксеем Дударавым на факультэце журналістыкі.

А ЯК У ІХ?

# ДАРАГАЯ ЎЦЕХА

Плата за атрыманне вышэйшай адукацыі ў амерыканскіх прыватных каледжах і універсітэтах узрасла ў гэтым годзе ў сярэднім на 7 працэнтаў, а ў ВНУ, якія не адносяцца да прыватнага сектара, — на 10 працэнтаў, паведаміў у сваім штогадовым дакладзе Савет каледжаў. Гэта асацыяцыя, якая базіруецца ў Нью-Йорку, аб'ядноўвае 2800 вышэйшых навучальных устаноў ЗША.

Студэнтам прыватных каледжаў з чатырохгадовай праграмай навучання прыйдзецца заплаціць у гэтым годзе ў сярэднім 10498 долараў. У гэтую суму не ўваходзяць плата за пакой у студэнцкім гарадку, харчаванне, карыстанне падручнікамі, а таксама транспартныя выдаткі. У цэлым жа, да прыклада, студэнтам Гарвардскага універсітэта год навучання абыйдзецца ў 23514 долараў. У Масачусецкім тэхналагічным інстытуце — 23565 долараў, у найбольш дарагой прыватнай ВНУ — Сара Лоурэнс-каледжы ў Бранксвіллі — 24380 долараў.

Па словах прэзідэнта нацыянальнай асацыяцыі незалежных каледжаў і універсітэтаў Рычарда Росера, асноўная прычына, якая прымушае кіраўнікоў ВНУ павышаць плату за навучанне,— недастатковая фінансавая дапамога як на федэральным узроўні, так і на ўзроўні штатаў. З кожным годам узрастаюць выдаткі на эксплуатацыю вучэбных і жылых карпусоў, у сувязі з інфляцыяй патрэбна павышаць зарплату выкладчыкам, ажыццяўляць усё ўзрастаючыя выплаты ў пенсійны, страхавы і іншыя фонды.

Студэнтам жа і іх сем'ям, каб звесці канцы з канцамі, даводзіцца ўлазіць у даўгі. За апошнія 15 гадоў, па дадзеных міністэрства адукацыі, на 50 працэнтаў павялічылася колькасць пазык, якія былі ўзяты спецыяльна для атрымання навучання. «Многія са студэнтаў заканчваюць каледжы і універсітэты, маючы даўгі ў памеры 20—30 тысяч долараў»,— адзначыў прэзідэнт асацыяцыі студэнтаў ЗША Лейтан.

**А. ПАХОМАЎ,**
**кар. ИТАР — ТАСС.**



# АНТЫГАЛАДОЎКА!

***Што б падумалі вы, убачыўшы сярод плошчы Незалежнасці ў Мінску добра сервіраваны стол на дваіх? Не, я ў поўным парадку. І хлопцы, якія ўдзельнічалі ў гэтым урачыстым абедзе, таксама. Проста гэта прыкметы непазбежнага набліжэння Усесаюзных (?) Дзён фізіка (УДФ-6), якія пачаліся 16 лістапада і будуць працягвацца да 22-га.***

***Гэтую акцыю назвалі антыгаладоўкай. А якія ж у яе мэты? Мы спыталі аб гэтым саміх «пікетчыкаў» і пачулі ў адказ сціплае: «Ды хопіць вам, проста есці хочацца».***

***А калі так — прыемнага апетыту! І да сустрэчы на УДФ-6!***

***С. МАЛІНОЎСКІ.***
***Фота С. ВАСІЛЬЕВА.***

ЛЮСТЭРКА

# ДРУК ПАД ПРЭСАМ

***Грамадскую думку, вядома, у асноўным фарміруюць сродкі масавай інфармацыі. І тое, што адбываецца са СМІ у палітычнай і эканамічнай сістэме пераходнага грамадства, уплывае і на нас з вамі.***

***Сацыяльная група па вывучэнню сродкаў масавай інфармацыі працуе ў БДУ ужо 15 гадоў. Цяпер сацыёлагі пад кіраўніцтвам доктара сацыялагічных навук Алега Цімафеевіча МАНАЕВА вывучаюць ролю СМІ у працэсе дэмакратызацыі беларускага грамадства.***

***Дарэчы, Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў, таксама пад кіраўніцтвам Алега Цімафеевіча, адзін са сваіх навуковых праектаў прысвяціў менавіта гэтай праблеме.***

**— Алег Цімафеевіч, ці можна ўявіць, што наша грамадства, выбраўшыся з крызісу, больш не вернецца да таталітарызму?**

— На мой погляд, можна вызначыць два асноўныя шляхі развіцця посттаталітарнага грамадства. Першы шлях можна назваць рэфармацыйным — той, што прадугледжвае сацыяльныя пераўтварэнні, у выніку якіх мяняюцца сістэмастваральныя прыкметы дадзенага грамадства. У выніку другога шляху — назавём яго ўмоўна трансфармацыйным — фарміруецца грамадства, якое знешне адрозніваецца ад ранейшага, але захоўвае ў сабе асноўныя элементы мінулай структуры і функцый.

Сёння яшчэ рана гаварыць пра тое, што наша грамадства развіваецца па «радыкальна-рэфармацыйнаму» шляху. Калі ж трансфармацыя ператворыцца ў рэфармацыю? Ці патрэбны для гэтага новыя рэвалюцыі? Думаю, што не.

Гэта адбудзецца тады, калі будзе дасягнута некаторая «крытычная маса» сацыяльных суб'ектаў — у палітыцы, эканоміцы, культуры, гэта значыць сфарміруецца цывільнае грамадства, якое яшчэ Гегель вызначыў як «публічную сферу прыватных інтарэсаў». Хутчэй за ўсё, гэтая падзея пройдзе незаўважна, але яна ўстановіць неадольную перашкоду для ўзнаўлення таталітарызму ў любой яго форме.

Мажліва, сродкі масавай інфармацыі больш за іншыя інстытуты грамадства адпавядаюць нялёгкай ролі развіцця дэмакратыі.

**— А ці можна на дадзеным этапе назваць сродкі масавай інфармацыі рэспублікі «чацвёртай уладай»?**

— Друк, як і раней, з'яўляецца ўсё ж прыладай сацыяльнага кіравання, перш за ўсё з боку розных структур улады. Але калі раней дзейнасць СМІ курыравала каля дзесяці чалавек з ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ, то ўсяго за два гады ў нетрах дзяржавы ўзнікла новая, куды больш разгалінаваная і гібкая структура кіравання, у якой задзейнічана ўжо некалькі дзесяткаў чалавек. Адносіны заканадаўчай улады і СМІ у цэлым можна ахарактарызаваць як юрыдычны казус, паколькі іх дзейнасць у Беларусі фактычна рэгулюецца законам аб друку СССР, краіны, якая, дарэчы, ужо знікла з палітычнай карты свету.

Адносіны ж выканаўчай улады да СМІ яскрава вызначаны ў праграмных выступленнях яе лідэраў і функцыянераў. Так, кіраўнік аддзела друку, радыё і тэлебачання Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. Паваляеў у сваім першым публічным выступленні заклікаў да «кантролю і рэгулявання дзейнасці СМІ», а праз месяц сам прэм'ер-міністр рэспублікі В. Кебіч паведаміў, як гэта рабіць: «Урад крэдытуе газеты і часопісы, якія стаяць на правільных пазіцыях. Навошта крэдытаваць газету, якая спрабуе парушыць стабільнасць у нашым грамадстве? Я буду падтрымліваць увесь друк за выключэннем тых выданняў, якія выступаюць супраць урада».

**— І ўсё ж, калі наш чытач прыходзіць да кіёска, бачыць вялікую колькасць новых выданняў, яму здаецца, што плюралізм, нарэшце, дасягнуты...**

— Гэта не зусім так. На 1 красавіка 1992 года Міністэрствам інфармацыі было зарэгістравана 550 выданняў (сёння іх больш за 600), разавы наклад якіх складаў 10 мільёнаў экземпляраў (дарэчы, па аднаму на кожнага жыхара рэспублікі разам з немаўлятамі). Але галоўнае — гэта ўласнасць. У выніку нашых даследванняў высветлілася, што заснавальнікамі амаль 64 працэнтаў усіх выданняў выступаюць старыя сацыяльныя суб'екты (кампартыя, камсамол, афіцыйныя прафсаюзы, розныя дзяржаўныя структуры і г. д.), а 36 працэнтаў — новыя (новыя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, незалежныя прафсаюзы, структуры недзяржаўнай эканомікі і г. д.). А калі звярнуць увагу на склад сузаснавальнікаў рэдакцыйных калектываў, то можна заўважыць, што каля 80 працэнтаў выданняў, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца самі журналісты, маюць сузаснавальнікаў, 90 працэнтаў якіх прадстаўляюць старую сацыяльную структуру.

Такім чынам, шырока распаўсюджанае меркаванне пра «вызваленне друку» шляхам перадачы выданняў у рукі саміх журналістаў — не больш, як чарговы міф, які хавае сутнасць адносін уласнасці ў сферы масавай камунікацыі.

Наш урад часта гаворыць пра тое, што ён з'яўляецца заснавальнікам менш чым 10 выданняў. Аднак, калі нават абстрагавацца ад таго, што гэтыя выданні маюць самы вялікі наклад у рэспубліцы (прыкладна 2 мільёны экземпляраў аднаразовага выпуску), трэба мець на ўвазе тое, што дзяржава — гэта не толькі ўрад. Розныя міністэрствы, прадпрыемствы, якія з'яўляюцца заснавальнікамі больш як 170 выданняў, усё яшчэ належаць дзяржаве і кіруюцца тым жа самым урадам праз разнастайныя структуры.

**— У Беларусі асноўнай сілай, якая процістаяла камунізму, былі нацыянальна-дэмакратычныя партыі і рухі. Як яны ставяцца да сваіх СМІ? Ці можна лічыць іх адносіны дэмакратычнымі?**

— На шляху набліжэння да ўлады гэтыя сілы рабілі ўсё больш відавочны акцэнт на каштоўнасці і прынцыпы развіцця грамадства і незалежнасці асобы. Для прыкладу. У пачатку 1992 года ўзнікла непаразуменне паміж кіраўніцтвам БНФ і самай вядомай альтэрнатыўнай газетай рэспублікі «Навіны БНФ». Ва ўмовах рынку супрацоўнікі рэдакцыі вырашылі пашырыць сферу сваёй дзейнасці, каб забяспечыць рэнтабельнасць газеты. Аднак кіраўніцтва Фронта не толькі не згадзілася з прапановамі журналістаў, але нават спецыяльным рашэннем прызначыла намесніка старшыні БНФ Ю. Хадыку палітычным рэдактарам, а па сутнасці — цэнзарам. Журналісты былі вымушаны адмовіцца ад правоў на газету. А кіраўніцтва, у тым ліку і палітычны рэдактар, так і не знайшлі новых людзей, каб арганізаваць выпуск «палітычна правільнай» газеты.

**— Атрымліваецца, што некаторыя з новых палітычных сіл дзейнічаюць па «прынцыпу люстэрка»?**

— Так, яны карыстаюцца тымі ж метадамі, што і таталітарызм, але як бы з процілеглым знакам. Чаму многія нашы новыя палітыкі карыстаюцца ранейшым алгарытмам адносін са СМІ? Існуюць, на маю думку, дзве прычыны. Па-першае, друк успрымаецца імі як інструмент сацыяльнага кіравання. Па-другое, звышідэя, якая акрэслівае дзейнасць гэтых новых палітыкаў, з'яўляецца ўсё тая ж ідэя Нацыі і Дзяржавы, а не ідэя Грамадства і Асобы.

Трэба дадаць, што пашырэнне ўлады дзяржавы вядзе да цяжкіх сацыяльных вынікаў, а ў далейшым — да рэстаўрацыі таталітарызму. Прычым гэта ёсць не вынік намераў і дзеянняў тых ці іншых палітыкаў, а заканамерны вынік развіцця самой ідэі Дзяржавы. Так, рэдактар маскоўскай газеты «День», вядомы ідэолаг «новай правай» А. Праханаў неяк даўно сказаў: «Самае галоўнае — гэта захаваць цэласнасць Дзяржавы. Сёння практычна не мае значэння, якія палітычныя сілы прывядуць да яе стварэння. Няхай хоць фашызм, таму што калі будзе магчымасць стварыць вялікую Рускую Дзяржаву толькі з дапамогай фашызму, я згодны. З цягам часу будуць, мажліва, пераадольваць фашызм, толькі б дзяржава была створана».

Такім чынам, кола замыкаецца: таталітарная мадэль масавай камунікацыі, што сфарміравана на аснове камуністычнай ідэалогіі, злучаецца з таталітарнай мадэллю, якая фарміруецца на аснове ідэалогіі нацыяналізму.

**Гутарку вяла**
**Т. КАЗАК.**



